ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
________ І.Г.Лашкевіч
«__» сакавіка 2022 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

Дата правядзення: 30 сакавіка 2022 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

**VII клас**

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Як вы назавяце чалавека, які атрымлівае пісьмы: *адрасант* ці *адрасат*? Што абазначае другое паняцце? ________________________________________
________________________________________________________________
2. Знайдзіце лішняе слова ў ліку пералічаных і растлумачце свой выбар: *дактыль, ямб, метафара, харэй, анапест, амфібрахій*? _______________
________________________________________________________________
3. Закончыце фармулёўку: *Арфаграфія — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца*________________________________________________
4. На плошчы Незалежнасці ў Мінску пабудаваны фантан “Беларусь”. Яго ўпрыгожваюць тры бронзавыя птушкі на вянку з калосся, якія сімвалізуюць нашу краіну. Якія птушкі “ўзлятаюць” з цэнтральнай і найбуйнейшай плошчы сталіцы Беларусі? ______________________________
5. Узгадайце пісьменнікаў (паэтаў)–юбіляраў 2022 года. Запішыце прозвішча і імя (псеўданім) **аднаго** з іх.________________________________________

**Заданне 2. Падайце арфаграфічны запіс слоў, што прыведзены ў транскрыпцыі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| [лантшафт] | |
| [дз’ас’атка] | |
| [спачына] | |
| [йім’іч] | |
| [б’эларуск’і] | |

**Заданне 3. Аднавіце ўстойлівыя спалучэнні па іх агульным значэнні, пачынаючы са слова** *глядзець.*

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | | |
|---|---|---|
| “падманваць каго-небудзь, гаворачы няпраўду” | | |
| “аднабакова, шаблонна ацэньваць, характарызаваць каго-небудзь” | | |
| “даходзіць да моцнага адчаю, маркоціцца, сумаваць” | вешаць | |
| “нагаворваць на каго-небудзь, лаяць, абвінавачваючы ў чым-небудзь” | | |
| “без апетыту, неахвотна” | | |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце фрагмент анатацыі на кнігу Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Эту книгу можно назвать энциклопедией белорусского народа, его фольклора и традиций. В весьма доступной и часто остроумной форме автор изображает верования жителей северной Беларуси. Истории, передаваемые из уст в уста, превратились в легенды и предания, которым свято верили, которым следовали. Пришедшие из стародавних времен рассказы были для автора историей этой земли, характера и чувств белорусов.______________________________________________

**Заданне 5. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі парамі слоў у першым слупку і іх сэнсавай характарыстыкай ў другім. Адказ запішыце, спалучыўшы лічбу і літару (напрыклад: А1, Б2, В3, Г4).**

*Максімальная колькасць балаў – 4 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| А. **Работа** сэрца і друкаваная **работа** | 1. Амонімы |
| Б. Мацярынская **ласка** і **ласка** – маленькая драпежніца | 2. Мнагазначнае слова |
| В. **Актыўная** пазіцыя і **пасіўная** пазіцыя | 3. Антонімы |
| Г. **Беспадстаўны** вывад і **беспрычынны** смех | 4. Сінонімы |

**Адказ:** А__; Б__; В__; Г__.

**Заданне 6. Прачытайце загадкі, знайдзіце прыметнікі і запішыце іх у другі слупок. Вызначце разрад прыметніка па значэнні і яго сінтаксічную ролю.**

*Максімальная колькасць балаў – 6*
*(0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| Загадка | Прыметнік | Сінтаксічная роля | Разрад прыметніка па значэнні |
|---|---|---|---|
| Два браты пузатыя на гару бягуць. | | | |
| Ляжыць на зямлі паніч, ён доўгі, як біч. | | | |
| Каціліся каточкі па ліпавым масточку, як убачылі зорку, дык шмыг у норку. | | | |
| У нашай кавалісі сабакі дужа ліхі – ні адбіцца, ні адбараніцца, ані хлеба даць. | | | |

**Заданне 7. Пастаўце адпаведныя знакі ў пустыя клеткі табліцы. Пры адказе “так” пастаўце знак “+”, пры адказе “не” – пастаўце “–”.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| № | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| 1. | Колькаснае значэнне маюць не толькі лічэбнікі, але і некаторыя словы іншых часцін мовы: назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы. | |
| 2. | Словы, што ўваходзяць у склад фразеалагізма, з’яўляюцца адным членам сказа. | |
| 3. | Пры скланенні састаўных колькасных лічэбнікаў змяняецца толькі апошняе слова. | |
| 4. | Паэма – невялікі празаічны твор, у якім услаўляюцца велічныя або незвычайныя падзеі, што моцна ўсхвалявалі аўтара, расказваецца пра гераічныя ўчынкі і подзвігі выдатных людзей, паэтызуюцца моцныя, выключныя характары. | |
| 5. | Мастацкая ідэя – жыццёвая з’ява або кола з’яў, пра якія ідзе размова ў творы. | |

**Заданне 8. Вызначце марфему, у склад якой уваходзяць гукі, што абазначаюцца ў прапанаваных словах выдзеленай літарай.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(0,5 бала – за кожную правільна вызначаную марфему).*

| Слова | Прыстаўка | Корань | Суфікс | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|---|
| Узор: звярнуцца | | | | | + |
| вадзіцель | | | | | |
| шасцісот | | | | | |
| чагосьці | | | | | |
| запісаць | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| зробіць | | | | | |
| паднесці | | | | | |
| дадому | | | | | |
| ударыць | | | | | |
| усміхнуцца | | | | | |
| двумастамі | | | | | |

**Заданне 9. Запоўніце табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| Назва твора | Аўтар | Персанаж | Мастацкі змест | Жанр |
|---|---|---|---|---|
| | Янка Купала | Гусляр | Праблема мастака і мастацтва ў жыцці народа | |
| | | Серж | Бацькі і дзеці: праблемы гуманнасці, высакароднасці, сумленнасці | Аповесць |
| "Салодкія яблыкі" | | Тонік, Арсенік | Вайна праз прызму дзіцячага ўспрымання | |
| | | Тэкля | Вайна нанесла невылечныя раны маці, якая не дачакалася свайго сына | Апавяданне |
| "Сябры" | Алена Васілевіч | Лёня і Грыша | | |

**Заданне 10. Адзначце, якія вобразна-выяўленчыя сродкі падкрэслены ў прапанаваных вершаваных радках.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Вершаваныя радкі | Вобразна-выяўленчы сродак (троп) |
|---|---|
| Як матулька, вярба<br>Хіліць голаў над ім.<br>*Якуб Колас* | |
| Вятрыска шаптаў яго з лісцем між гаю –<br>кахаю, кахаю... кахаю, кахаю...<br>*Данута Бічэль* | |
| Адхінае вечар<br>тонкія мярэжы…<br>*Паўлюк Трус* | |
| Навакол усё паветра ў струнах сонца залатых…<br>*Максім Багдановіч* | |
| Ляжыць на стале маім бохан —<br>Па зярнятку з вякоў назапашаны,<br>У дзяжы ліхалеццяў заквашаны…<br>*Мікола Арочка* | |